УДК 821.161.3.0

# АПОКАЛИПТИЧЕСКИЕ МОТИВЫ В ТЕТРАЛОГИИ ВЯЧЕСЛАВА АДАМЧИКА

*Н. Г. АПАНАСОВИЧ*[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Апокалиптические мотивы в тетралогии В. Адамчика (четыре книги вышли с 1977 по 1990 г.) рассматриваются как художественное воплощение трагичности белорусской народной судьбы. Прослеживается взаимосвязь и взаимозависимость всех проявлений национального, их влияние на судьбу отдельного человека и нации в целом. Анализируется выявленное на материале западнобелорусского контекста экзистенциальное противоречие бытия человека как действенного субъекта жизни и жертвы истории. Специфика авторского видения трагической белорусской судьбы показывается через триаду *грех – расплата – покаяние* в антропоцентрическом ракурсе (внимание к человеку, его повседневности, вынужденная включенность в события истории). Подчеркивается намерение В. Адамчика избежать однозначности, осмыслить аксиологические противоречия, осознать масштаб ментальной катастрофы во время глобальных конфликтов. Сделан вывод о включенности повествования в христианский контекст, согласно которому судьба белорусов представлена как многострадальный крестный путь.

***Ключевые слова:*** В. Адамчик; тетралогия; апокалиптические мотивы; западнобелорусский контекст; ментальная катастрофа.

# АПАКАЛІПТЫЧНЫЯ МАТЫВЫ Ў ТЭТРАЛОГІІ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА

*Н. Г. АПАНАСОВІЧ*[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Апакаліптычныя матывы ў тэтралогіі В. Адамчыка (чатыры кнігі выйшлі з 1977 да 1990 г.) разглядаюцца як мастацкае ўвасабленне трагічнасці беларускага народнага лёсу. Прасочваецца ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць усіх праяў нацыянальнага, іх уплыў на лёс асобнага чалавека і нацыі ў цэлым. Аналізуецца выяўленая на матэрыяле заходнебеларускага кантэксту экзістэнцыяльная супярэчнасць быцця чалавека як дзейснага суб'екта жыцця і ахвяры гісторыі. Спецыфіка аўтарскага бачання трагічнага беларускага лёсу паказваецца праз трыяду *грэх – расплата – пакаянне* ў антрапацэнтрычным ракурсе (увага да чалавека, яго паўсядзённасці, змушаная ўключанасць у падзеі гісторыі). Падкрэсліваецца намер В. Адамчыка пазбегнуць адназначнасці, асэнсаваць аксіялагічныя супярэчнасці, усвядоміць маштаб ментальнай катастрофы ў час глабальных канфліктаў. Зроблена выснова пра скіраванасць аповеду ў хрысціянскі кантэкст, адпаведна якому лёс беларусаў прадстаўлены як шматпакутны крыжовы шлях.

***Ключавыя словы:*** В. Адамчык; тэтралогія; апакаліптычныя матывы; заходнебеларускі кантэкст; ментальная катастрофа.

**Образец цитирования:**
Апанасовіч НГ. Апакаліптычныя матывы ў тэтралогіі Вячаслава Адамчыка. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2020;2:15–25.

**For citation:**
Apanasovich NG. The apocalyptic motives in the tetralogy by Viachaslau Adamchyk. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2020;2:15–25. Belarusian.

**Автор:**
***Наталья Геннадьевна Апанасович*** – аспирантка кафедры истории белорусской литературы филологического факультета. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор Л. Д. Синькова.

**Author:**
***Natallya G. Apanasovich***, postgraduate student at the department of history of Belarusian literature, faculty of philology.
*apanata@yandex.ru*

CC BY NC

# THE APOCALYPTIC MOTIVES IN THE TETRALOGY BY VIACHASLAU ADAMCHYK

***N. G. APANASOVICH***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article deals with the apocalyptic moties in the tetralogy by V. Adamchyk (four books, 1977–1990) as the way of artistic expression of the writer's concept of the tragedy of the Belarusian people's fate. The interrelationship and interdependence of all forms of the national existence as well as their impact on the fate of the individual and the nation as a whole are shown. The researcher analyzes the existential contradiction of human existence as an agent in their life and as a victim of history revealed in the Western Belarusian context. The peculiarities of the author's view on the tragic Belarusian fate are presented through the triad *sin – atonement – penitence*, through an anthropocentric perspective (attention to a person, their daily life, involuntary involvement in historical events). The emphasis is made on the V. Adamchyk's desire to avoid ambiguity, to comprehend axiological contradictions, to realize the scale of a mental catastrophe during the global conflicts. It is concluded that the narration is set in the Christian context, according to which the fate of the Belarusian is presented as the longsuffering way.

***Keywords:*** V. Adamchyk; tetralogy; apocalyptic motives; Western Belarusian context; mental disaster.

## Уводзіны

Тэтралогія Вячаслава Адамчыка («Чужая бацькаўшчына» (1977), «Год нулявы» (1982), «І скажа той, хто народзіцца» (1987), «Голас крыві брата твайго» (1990)) стала адной з грунтоўных спроб даследавання трагічнага беларускага лёсу ў прозе, напісанай у савецкія і познесавецкія часы. У асэнсаванні дадзенай праблематыкі пісьменнік паказаў сябе прадаўжальнікам беларускай традыцыі. Разам з тым, паводле В. Каваленкі, раманы з'яўляюцца творамі выразна сучаснага літаратурнага мыслення [1, с. 533], якое рэалізавана на ўзроўні паэтыкі і прадстаўлена ў ідэйна-змястоўным складніку.

Рэпрэзентацыя лёсу беларусаў у аспекце трагічнага афармляецца ў пачатку XX ст. найперш у творах класікаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, Ц. Гартнага, К. Чорнага, Л. Калюгі [2, с. 173–183, 192]. На думку А. Мельнікавай, «у ідэнтыфікацыйны код беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя закладваецца канцэпцыя трагедыйнага лёсу нацыі, што тлумачылася геапалітычным становішчам краю і неспрыяльнымі гістарычнымі ўмовамі» [2, с. 83]. Пошукі адказаў на пытанні пра нацыянальную самаідэнтыфікацыю, якія і сёння застаюцца актуальнымі, не вырашанымі ў поўнай меры, працягваюцца найперш праз аналіз гісторыка-культурнага кантэксту і асэнсаванне месца беларускіх зямель на палітыка-геаграфічным і культурным «скрыжаваннях». Цэлы комплекс праблем быў выяўлены ўжо ў пачатку XX ст.; сярод іх найважнейшымі сталі адсутнасць у беларусаў сваёй дзяржаўнасці, адчуванне сябе на цывілізацыйным раздарожжы, канфесійная залежнасць ад іншанацыянальных цэнтраў, сіндром прыстасавальніцтва.

Мастацкае асэнсаванне праблемы ў гэтых двух ракурсах (геапалітычнае становішча і гісторыя) як вызначальных у мастацкім асваенні трагедыі нацыянальнай ментальнасці было працягнута пісьменнікамі-эпікамі (у тым ліку заходнебеларускімі) і ў савецкі перыяд развіцця беларускай літаратуры. Рэалізаваў гэту стратэгію і В. Адамчык у тэтралогіі, якой можна было б даць агульную назву, канцэптуальна вызначаную найменнем першага твора, – «Чужая бацькаўшчына». Паводле Т. Грамадчанка, творы У. Караткевіча, Я. Брыля, В. Адамчыка аспрэчваюць даволі распаўсюджанае меркаванне пра занядбанасць, нераспрацаванасць нацыянальнай ідэі ў беларускай літаратуры пасляваенных дзесяцігоддзяў [3, с. 11].

Творчасць В. Адамчыка дастаткова добра вывучана ў сучасным беларускім літаратуразнаўстве (манаграфіі Я. Лецкі, Н. Дамброўскай, працы В. Каваленкі, М. Тычыны, Г. Тычко, Л. Корань, А. Мельнікавай, артыкулы Н. Суддзевай, Т. Грамадчанка, Ю. Шчукі, З. Траццяк, Н. Лысовай і інш.). Пра асэнсаванне лёсу беларускага народа як трагічнага ў раманах В. Адамчыка пісалі В. Каваленка, М. Тычына, Г. Тычко, Л. Корань, Н. Суддзева, Т. Грамадчанка, А. Мельнікава і іншыя даследчыкі.

Я. Лецка адзначаў імкненне пісьменніка паказаць народны лёс з розных планаў, скіраваць чытача да палемікі [4]. Даследчык падкрэсліваў, што раманамі «Чужая бацькаўшчына» і «Год нулявы» «празаік прад'явіў суровы і патрабавальны рахунак "праклятаму мінуламу"», але «разам з гэтым ён не вызваляе ад адказнасці за свае ўчынкі, не спісвае віны з "несвядомых" асоб» [4, с. 125]. Адзін з ракурсаў асэнсавання трагічнага лёсу беларусаў Я. Лецка бачыў ва ўзнятай у раманах праблеме злачынства і пакарання, погляд на якую праз маральна-этычную прызму паказваў гуманістычную глыбіню твораў. Літаратуразнаўца

пісаў: «Крызісная, тупіковая сітуацыя якраз і спатрэбілася празаіку дзеля таго, каб сцвердзіць у мастацкай форме думку пра тое, што чалавек ніколі і ні пры якіх абставінах не мае права пераступіць мяжу чалавечнасці» [4, с. 125]. Гэта выснова ў поўнай меры можа быць аднесена да ўсёй тэтралогіі.

У артыкуле «На неспазнаны круг жыцця...», прымеркаваным да ўзнагароджання В. Адамчыка Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа за раманы «Чужая бацькаўшчына», «Год нулявы», «І скажа той, хто народзіцца», Г. Тычко падтрымала пазіцыю пісьменніка ў меншай ступені судзіць, а ў большай – спрабаваць паказваць усю складанасць і заблытанасць жыццёвых калізій насельнікаў заходнебеларускіх зямель. Даследчыца звярнула ўвагу на псіхалагічна праўдзівыя і пераканаўчыя вобразы ў раманах, раскрытыя са шчырым спачуваннем, глыбокім разуменнем і надзеяй: «Ёсць не намі прыдуманая праўда, што духоўныя трагедыі і перажыванні ўзвышаюць чалавека, робяць яго больш высакародным. І В. Адамчык у сваёй трылогіі нібы выпрабоўвае гэтую праўду. Амаль кожнаму са сваіх герояў ён дае шанс на ачышчэнне» [5, с. 7].

Н. Дамброўская характарызавала глыбіню разумення трагізму народнага шляху Адамчыкам-філосафам праз немагчымасць «вяртання назад былога жыцця для выпраўлення памылак з мэтай пазбегнуць трагічнага лёсу і Божага наканавання» [6, с. 67].

Выхад кожнага рамана выклікаў палеміку, стымуляваў літаратуразнаўчую дыскусію. У першай рэцэнзіі на раман «Чужая бацькаўшчына» А. Рагуля сцвярджаў, што, паводле В. Адамчыка, «жыццё народа без вялікай, яднаючай ідэі ў корані сваім фальшывае, несапраўднае, абсурднае, яно падобнае на “збэрсаны” маток нітак» [7, с. 7]. Літаратуразнаўца гаварыў пра характэрную рысу стылю пісьменніка – з’яўленне «героя заходнебеларускай рэчаіснасці, пазбаўленага права на будучыню» [7, с. 7]. Знешняя засяроджанасць аўтарскай думкі на побытавым жыцці вяскоўцаў, адсутнасць пафаснасці доўгі час звужалі глыбіню асэнсавання рамана.

Неадназначныя ацэнкі мелі і іншыя раманы тэтралогіі. Так, Н. Суддзева меркавала, што ў апошнім рамане цыкла «Голас крыві брата твайго» В. Адамчык прынцыпова памяняў погляд на праблемы нацыянальнай гісторыі і зрабіў «заяўку на канцэпцыю фатальнай асуджанасці чалавечага жыцця ў навакольным свеце вялікай гісторыі» [8, с. 68]. На яе думку, аўтар больш кіраваўся перабудовачнай модай на перагляд ведаў пра Вялікую Айчынную вайну, чым логікай ідэйна-змястоўнага складніка [8, с. 68]. Па-рознаму інтэрпрэтавалася смерць героя-інтэлігента Міці Корсака ад рук бандыта-партызана Жэніка Рэпкі. В. Каваленка разглядаў «негераічны» фінал як трагічную ваенную недарэчнасць. Даследчык тлумачыў адсутнасць асуджэння Міці аўтарам праз супярэчлівасць самога вобраза, неадназначнасць ацэнак узнятай праблематыкі (псіхалагічна-светапоглядныя хістанні) у савецкім грамадстве. Т. Грамадчанка, наадварот, такі адкрыты фінал жыцця галоўнага героя падаўся цалкам заканамерным. Яна ўбачыла ў ім Адамчыкава разуменне парадоксу часу, у якім валадарамі чалавечых лёсаў сталі нікчэмныя асобы [3, с. 14]. Л. Корань таксама пісала пра непазбежнасць з’яўлення такога тыпу партызана, якому савецкая ўлада дала «магчымасць адкрыта і агрэсіўна спаганяць з аднавяскоўцаў і чужых свае застарэлыя крыўды на ўвесь свет» [9, с. 173].

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца разгляд тэмы трагічнага беларускага лёсу праз прызму апакаліптычных матываў у тэтралогіі В. Адамчыка. Гэта тэма – адна з асноўных у беларускай літаратуры ХХ ст. Актуалізацыя яе ў апошнія 30 гадоў звязана з вяртаннем цікавасці да праблематыкі нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, пошуку нацыянальнай ідэі і героя. Сучаснае пераасэнсаванне этнанацыянальнага дыскурсу, у тым ліку і праз навязванне комплексу нацыянальнай непаўнавартасці, пашырэнне ідэй заходнерусізму, русафільства, непрыняцце праяў крайняга нацыяналізму шырокімі коламі насельніцтва і многае іншае, спрыяе запыту на мастацкія тэксты, творы класікаў, дзе няма адназначнай ацэначнасці і безапеляцыйных высноў. У гэтым сэнсе тэтралогія В. Адамчыка з’яўляецца каштоўнай крыніцай па выяўленні праблемнага кола асэнсавання першапрычын нацыянальнага занядбання, прагназавання будучыні.

Акрамя гэтага, мастацкія творы, якія ўтрымліваюць звесткі пра заходнебеларускі кантэкст, цікавяць вучоных у сувязі з даследаваннем феномена памежжа, праблематыка якога апошнім часам актыўна распрацоўваецца ў гуманітарнай сферы (П. Церашковіч, І. Бабкоў, М. Беспамятных, У. Разенфельд, С. Данскіх, А. Мельнікава, М. Хмяльніцкі і інш.). Тэтралогія В. Адамчыка змяшчае багаты матэрыял для такіх работ.

Тэма трагічнага беларускага лёсу, прадстаўленая праз апакаліптычныя матывы, разглядалася фрагментарна і не прасочвалася праз усе раманы тэтралогіі В. Адамчыка. Аналіз апакаліптычных матываў як найважнейшых у раманнай спадчыне пісьменніка, паглыбленне даследчага ракурсу з пазіцыі этнанацыянальнага дыскурсу і феномена памежжа вызначаюць навізну гэтага даследавання.

Апісанне мастацкай рэалізацыі тэмы апакаліптычных матываў, высвятленне аўтарскага бачання трагічнага лёсу беларусаў праведзены на аснове аналізу вобразнай сістэмы – праз асэнсаванне лёсаў асобных персанажаў, з якіх складваецца жыццё народа. Тэарэтычнай базай для даследавання паслужылі

працы В. Каваленкі, Я. Лецкі, М. Тычыны, Л. Корань, Г. Тычко, А. Мельнікавай, Н. Дамброўскай, Н. Суддзевай, Т. Грамадчанка. Літаратуразнаўчы аналіз твораў ажыццяўляўся з дапамогай культурна-гістарычнага і параўнальна-гістарычнага метадаў.

## Вынікі і іх абмеркаванне

Асэнсоўваючы канцэпцыю трагічнага лёсу нацыі ў тэтралогіі, Адамчык-эпік ставіў складаную задачу: максімальна поўна ахапіць увесь спектр прычын, уздзеянняў, з'яў, якія паўплывалі на нацыянальнае самаўсведамленне беларусаў. Аўтар бачыў народны шлях як трагічны, прыводзячы доказы ў традыцыйным для беларускай літаратуры рэчышчы: праз тэмы вёскі і вайны, адлюстраваныя ў стылі рэалізму ў жанры сацыяльна-бытавога рамана. Пісьменнік мадэлюе мастацкі хранатоп адпаведна нацыянальнай карціне свету, яго асновы прадстаўляе на ўзроўні паўсядзённага, выводзіць на старонкі раманаў шэраг разнастайных, складаных, супярэчлівых характараў. А. Мельнікава заўважае: «Апісваючы падзеі 1930–40-х гадоў, В. Адамчык акцэнтуе ўвагу на трагічным характары беларускай гісторыі, трагізме лёсу як асобнага чалавека, так і нацыі ў цэлым» [10, с. 169].

Пісьменнік імкнецца паказаць увесь спектр нацыяахоўных элементаў, падкрэслівае, што тут няма няважнага і неістотнага, а ад стаўлення да бягучых падзей і жыццёвых намераў кожнага залежыць лёс усіх. Мэта празаіка – прасачыць шлях да небяспечнай рысы, за якой пачынаецца энтрапія. Гэты шлях ідзе ад лакальнага – разрыву са сваёй сям'ёй, традыцыямі, ладам, мовай – да глабальных пераўтварэнняў, што паступова вядуць да страты ўласнага светабачання, традыцыйнай карціны свету і, урэшце, знікнення людской супольнасці як нацыі. Драматычныя лёсы асобнай сям'і, адной вёскі разглядаюцца шматпланава і падрабязна, што дае магчымасць правесці сімвалічныя паралелі з лёсам народа: маштаб трагедыі з прыватнай драмы павялічваецца да апакаліптычнага.

На рэалізацыю аўтарскай задумы працуюць і абраны гістарычны перыяд, лакацыя, прадстаўленыя як анталагічная непазбежнасць, дзе разгортваюцца лёсы персанажаў. Зварот да заходнебеларускай праблематыкі канца 1938 – сярэдзіны 1944 г. дазволіў В. Адамчыку ў сканцэнтраваным выглядзе праілюстраваць практычна ўвесь комплекс праблем нацыянальнага самавызначэння ў гістарычным, культурным, аксіялагічным, рэлігійным, псіхалагічным аспектах і праўдзіва выявіць усю складанасць, супярэчлівасць тагачаснай рэчаіснасці.

Як бы ні быў засяроджаны вясковец на сваім будзённым клопаце, ён вымушаны ўключацца ў трагічныя падзеі рэчаіснасці, выходзіць за межы свайго свету, прымаць рашэнні, рабіць выбар. Т. Грамадчанка заўважае: «Лёс беларуса заўжды быў залежны ад знешніх бур. І як ні адгароджваюцца верасаўцы асцярожнасцю, падазронасцю, абыякавасцю ад вялікага свету, жорсткі вецер гісторыі ўрываецца ў іх жыццё» [3, с. 12]. Выбраны В. Адамчыкам гістарычны перыяд з'яўляецца найлепшай ілюстрацыяй да гэтай прымусовай уключанасці, трагічнай непазбежнасці, калі сама рэчаіснасць патрабуе ад чалавека хуткіх дзеянняў, не пакідае часу на развагі, дае мінімум магчымасцей.

Такі ракурс дазволіў прадставіць дастаткова аб'ектыўную карціну, дзе гістарычныя абставіны, месца жыхарства выступаюць першапрычынай, што прадвызначае жыццёвыя ўмовы, і змяніць сітуацыю практычна немагчыма. Разам з тым погляд «знізу», з пазіцыі звычайнага вяскоўца, яго будзённага клопату, дазволіў асэнсаваць усе падзеі знутры. Аўтар разглядае праблемы адказнасці чалавека за сваё жыццё і дзеянні, вызначае межы магчымасцей і свабоды выбару, ступень уключанасці або ўдзелу ў гістарычных падзеях.

Імкненне асэнсаваць праблематыку нацыянальнага самавызначэння праз прызму прыватнага жыцця звычайнага чалавека не зменшыла глыбіні і маштабу мастацкага даследавання, а дазволіла пады-сці да раскрыцця тэмы, пазбягаючы ідэалагічнага клішыравання, патэтыкі высокіх тэм, адназначнасці і безапеляцыйнасці. Паводле Я. Лецкі, раман «Чужая бацькаўшчына» не толькі запоўніў істотны прагал у мастацкім асваенні раней невядомага чытачу жыццёвага матэрыялу – ён як бы па-свойму падсвяціў ужо напісанае пра Заходнюю Беларусь, паказаў вытокі і прычыны многіх з'яў [4, с. 93].

Як «прыхільнік аб'ектывізаванай творчай манеры пісьма» [11, с. 213], В. Адамчык не выступае суддзёй і не выносіць прысудаў, пазбягае стэрэатыпнасці. Творчыя задачы ён вызначаў такім чынам: «У кнігах хачу паказаць трагізм чалавечай душы, зачараванасць душы і яе злом, сутыкненне паміж дабром и злом, парыванні чалавечага сэрца і яго няволю» [12, с. 152]. Разам са сваімі героямі ён імкнуўся спасцігнуць сутнасць жыцця, з кожным прайсці адмераны лёсам крыжовы шлях.

Героі раманаў – простыя вяскоўцы, іх спадзяванні не звязаны са спасціжэннем сутнасці быцця, яны не мараць пра славу, перабудову свету. Іх памкненні – ідэал вясковага шчасця: мець зямлю, дом, сям'ю, добрых дзяцей. Але В. Адамчык пакідае права выбару спосабаў дасягнення жаданага за сваімі персанажамі, бо кожнаму самастойна давядзецца несці свой крыж, жыццёвую ношу, цяжар якой залежыць ад асобы чалавека і прадвызначаецца абставінамі, рознымі прычынамі.

Нехта з персанажаў, спрабуючы супраціўляцца лёсу, як галоўная гераіня Алеся, адважыўся на злачынства. Нехта, як Міця Корсак, стаў ахвярай абставін і практычна ператварыўся ў злачынцу. Для кагосьці маральнае падзенне – натуральнае і непазбежнае, для некага жыццё будзе выкупленнем віны, шляхам да пакаяння.

Набліжэнне моманту незваротнасці разглядаецца ў ракурсе хрысціянства, уключанага ў традыцыйную карціну свету беларусаў. Маральныя імператывы вызначаны логікай вясковага жыцця і сарыентаваны не толькі на боскі, але і на чалавечы суд. Паняцце злачынства ў сялянскай маралі звязваецца найперш з грахом і не абмяжоўваецца толькі крымінальнымі або злачыннымі дзеяннямі, ахоплівае значна больш шырокі спектр учынкаў.

Для селяніна важна, што скажуць людзі. Зварот Алесі да ксяндза наконт таго, каб пабрацца шлюбам з Імполем, звязаны найперш з жаданнем пачаць новае сямейнае жыццё так, як прынята ў вёсцы. Менавіта чалавечы суд меў на ўвазе стары Корсак, калі папярэджваў сына Міцю пра неадназначнасць працы на савецкую ўладу: *Спіс складацьмеш на арышт, во што будзеш рабіць* [13, с. 29].

Расплата – гэта адначасова канец і пачатак, надзея на пакаянне і дараванне, а значыць – на выратаванне. На гэтай узаемазалежнасці будуецца аповед, у якім апакаліптычныя матывы, трыяда *грэх – расплата – пакаянне* займаюць адно з вядучых месцаў, вызначаючы пафас і ідэйны змест раманаў. Праз усведамленне граху персанажы асэнсоўваюць і прымаюць свой лёс як вынік асабістых памкненняў і ўчынкаў.

Жыццё Алесі – гэта і супраціўленне абставінам, і перыпетыі жаночай долі, шлях да злачынства і прыняцце наканаванага. Прыгожая, на дзіва спрытная, па-гаспадарску ўвішная, яна рана засталася без маці. Так доўга перабірала жаніхоў, што выйшла замуж за нялюбага. Нянавісць да абрыдлага мужа падштурхнула да спробы забіць у сабе дзіця. Нараджэнне мёртвай дачкі распачало грэхападзенне Алесі. Упершыню думка пра пакаранне і збавенне прыйшла да жанчыны пасля перанесенай хваробы, якую яна палічыла вынікам сурокаў. А магілка немаўляці стала месцам, дзе яна спадзявалася выплакаць і адмаліць сваю адзіноту і няшчасце. Забойства свекрыві і залоўкі з надзеяй на шчасце ў новай сям’і з прышлым у вёску малацьбітом Імполем зрабіла з Алесі сапраўдную злачынцу. Зямля як перадумова ўдалага вясковага жыцця стала тым, за што маці і сястра былога мужа заплацілі жыццём, а галоўная гераіня – будучыняй*: ...не было ў яе шчасця, няма і не будзе. Так ужо рассудзіла доля* [13, с. 227]. Адплата здзейснілася неадкладна. Цяжарная Алеся яшчэ не нарадзіла дзіця, як муж злюбіўся з Хрысцяй. Толькі пасля гэтага галоўная гераіня стала здольнай да пакаяння. Пакуты былі настолькі моцнымі, што яна цвёрда намерылася ўсё скончыць, кінуўшыся пад цягнік. Ад гэтага падвойнага граху яе ўтрымалі рухі яшчэ не народжанага дзіцяці. Далейшае жыццё кардынальна змянілася і стала для Алесі і расплатай, і пакаяннем, і збаўленнем. Пошукі хоць якога супакаення прывялі яе да касцёла, размова са старой тэрціяркай пераканала ў неабходнасці споведзі і дала надзею на паратунак.

Працэс адплаты для гераіні быў доўгім і пакутлівым. Сямейнае жыццё ў яе так і не склалася. У час вайны Алеся, рызыкуючы, дала прытулак беднаму згаладаламу яўрэю. Нечакана і страшна загінуў яе бацька. Ёй прыйшлося пахаваць любага брата. Жыццё для галоўнай гераіні стала пакаянным шляхам да змен.

Драматычным было і нядоўгае жыццё Хрысці, якая так і не змагла пераадолець пакутлівае каханне да жанатага Імполя. Сірочыя нягоды ператварылі дзяўчыну з разлучніцы ў ахвяру. Працуючы ў шпіталі ў час гітлераўскай акупацыі, Хрысця дзялілася апошнім з прывезенымі з Расіі няшчаснымі дзецьмі. Рызыкуючы жыццём, паспрабавала ўратаваць яўрэя Ёселя. Збітая немцамі, нарадзіла мёртвае дзіця. Незадоўга да расстрэлу за супрацоўніцтва з польскімі партызанамі, пасля страшных і зневажальных катаванняў, Хрысця пераасэнсоўвала свой лёс: *...і за што, за які грэх прыняць смерць? Адзін хіба ёсць – перад Алесяй, што адбіла Імполя, злюбілася з ім. І адзін перад Богам, што пабраліся без шлюбу* [14, с. 236].

Грэх і пакаранне за яго – дзве катэгорыі, якія рэгулююць жыццёвы баланс у свядомасці вяскоўца, супадзенні звязваюць заканамернасцю, а нечаканае тлумачаць наканаваннем. У гэтай светапогляднай канстанце верасаўцаў спалучаецца і самастойнасць у прыняцці рашэння, і адказнасць за яго, і фаталістычная вера ў лёс, які нельга ні перахітрыць, ні падмануць. У ахвярнай смерці бацькі, які загінуў, спадзеючыся на справядлівасць немцаў і спрабуючы абараніць жыхароў суседняй вёскі, Алеся ўбачыла і сваю віну. На папялішчы са спаленымі людзьмі да яе прыйшло ўсведамленне жахлівай сувязі паміж здзейсненым ёю забойствам і пакутлівай гібеллю роднага чалавека: *Пэўна, за гэта да бацькі прыкінуўся грэх, бо згарэў у гумне* [14, с. 159]. Радаснае вяртанне Ваўчка, які здолеў цудам не трапіць на фронт з палком уланаў, азмрочылася смерцю маленькага сына. Гэту страту мужчына ўспрыняў як страшную плату за спробу ўратавацца самому, падмануць смерць.

Заўважым, што на працягу ўсяго аповеду В. Адамчык імкнецца да аб’ектыўнасці. На думку Г. Тычко, «пісьменнік далёкі ад ідэалізацыі сялянскага жыцця, сваіх персанажаў ён паказвае рэальна

няпростымі людзьмі» [11, с. 212]. Прымаючы супярэчлівасць чалавечай натуры, аўтар адкрыта не выказвае сімпатыю да сваіх персанажаў і не асуджае іх.

Складаны і заблытаны лёс Міці Корсака – *птаха з падрэзанымі крыламі* [15, с. 235]. Яго цярністы шлях стаў увасабленнем неаднойчы падманутай беларускай інтэлігенцыі. Апантаны беларускай ідэяй, хлопец адрозніваўся ад аднавяскоўцаў найперш узроўнем самасвядомасці, адчуваннем сваёй грамадзянскай адказнасці. Т. Грамадчанка сцвярджала: «Міця не адасоблены вучобай, набытай адукацыяй, паходжаннем ці, урэшце, хоць бы ваенным лёсам ад свайго асяроддзя, ён не толькі з народам, але – у народзе. Такога героя наша проза яшчэ не ведала» [3, с. 11]. Неаднаразова ўначы ён сам-насам разважаў пра жыццёвае прызначэнне: *...ён зробіць нешта вялікае на гэтай зямлі дзеля сябе і дзеля сваіх людзей, ён пойдзе ваяваць за іхнюю волю* [15, с. 102]. У яго развагах няма самалюбавання, гэта, хутчэй, юначы рамантызм, прысяга на служэнне народу, адказнасць за сваю далучанасць да грамадства, рашучасць і жаданне дзейнічаць. Як меркаваў В. Каваленка, «Міця ўжо прагне вялікай навукі і культуры, глыбокага пазнання свету, каб змяніць цяжкія сацыяльныя ўмовы існавання ўсяго народа» [1, с. 536].

Незнарок патрапіўшы каменем у п’янага чалавека замест сабакі, Міця *невядома чаму* [15, с. 347] зразумеў, што можна міжволі прынесці смерць. Ён глыбока задумаўся пра гэта пасля выпадковага разбурэння птушынага гнязда ў час касьбы. Развагі сталі прадчуваннем апакаліптычнай варожай навалы, апярэджаннем тых жыццёвых выпрабаванняў, што былі вызначаны лёсам і абставінамі. На пэўную зададзенасць, наканаванасць будучыні пратаганіста звяртала ўвагу Л. Корань: «Як носьбіт гуманітарнай рэфлексіі, ён павінен прайсці крыжовы шлях да канца, і па магчымасці шлях пакручасты, скампраметаваны...» [9, с. 176].

Папярэджаннем трагічнай прадвызначанасці лёсу беларускіх змагароў прагучалі звернутыя да Міці словы ксяндза з рамана «Год нулявы»: *Гэты люд не хоча ведаць свайго нічога... гэты народ не ўчуе вас, ён глухі не толькі да слова свайго, свае душы, ён, як смяртэльна хворы чалавек, не адгукаецца ні на што, ён адмірае ўжо. І вы не ідзіце гэтаю дарогаю шукаць яго, свой народ. Ён нават вам адпомсціць за гэта... Ён, гэты народ, даўно не разбірае, хто яму спрыяе, хто яму чыніць зло* [16, с. 209]. У такіх развагах і праўда, і безнадзейнасць, і спачуванне ўсім ахвярам беларускага руху як мінулага часу, так і з будучых пакаленняў. Дазволім сабе выказаць здагадку наконт упэўненасці аўтара ў тым, што без ведання глыбіні ментальнага канфлікту, прыняцця гэтай непрыемнай праўды пра сябе наўрад ці можна адшукаць выйсце. Ад смерці ў канцэнтрацыйным лагеры ў Картуз-Бярозе, куды Міця трапіў за свае беларускія перакананні яшчэ да пачатку Другой сусветнай вайны, яго ўратаваў сукамернік Мазура. Стары адгукнуўся на прозвішча Корсак, здагадаўшыся, што хлопца клічуць на расстрэл. Шмат разоў пасля гэтага юнак асэнсоўваў, што адбылося, і да радасці ад выратавання далучаліся згрызоты сумлення: *Няўжо Міця вінаваты ў тым, што няма на свеце Мазуры?* [13, с. 22].

Надыход савецкай улады, у якую Корсак шчыра верыў, распачаў новы этап жыццёвых выпрабаванняў. Яму прыйшлося ўдзельнічаць у пераразмеркаванні зямлі, раскулачванні землякоў, стаць ахвярай даносу. Выкліканы ў аддзел НКУС, Міця і сам павінен быў сведчыць супраць свайго старэйшага паплечніка, сапраўднага патрыёта Царыка. З супярэчлівымі пачуццямі Корсак назіраў за адпраўкай цягніка з асуджанымі савецкай уладай, куды трапілі былы верасаўскі солтыс Вайтовіч, дырэктар школы Табеш, начальнік дварчанскай станцыі Чыжэўскі, калега бацькі яго любай Чэсі. Калі яна прапанавала Міцю падысці бліжэй да вагонаў, ён адмовіўся, аргументуючы сваю пазіцыю меркаваннем пра адплату і справядлівасць: *Я не злы, але я адпакутаваў з добрай ласкі тых, што стаяць у тых вагончыках. Няўжо я павінен ім даравацъ?* [13, с. 256]. Даволі хутка хлопцу прыйшлося прымерыць на сябе ролю ўпаўнаважанага, прымаць удзел у высылцы сям’і Вайтовіча. Ахвярай стала Яніна, дачка Солтыса, цяпер ужо ворага народа. Нават вымушаны ўдзел не апраўдвае Міцю, а робіць з яго здрадніка ў вачах дзяўчыны – у адносінах да іх узаемнай закаханасці, да агульных планаў і мар пра вучобу і будучыню. В. Каваленка заўважаў: «Арыштоўваючы Яніну, кветку – сімвал роднай зямлі, ён здраджвае самому духу гэтай зямлі. І няма яму апраўдання» [17, с. 244].

Трагічным фіналам непрадказальных жыццёвых калізій стала супрацоўніцтва з антысавецкімі сіламі, што дзейнічалі на баку немцаў у час акупацыі. Міцю пераконваюць у тым, што на дадзеным этапе іншых варыянтаў служэння Беларусі няма. А немцы абяцаюць падтрымку: *Паслужыце покуль што ў нас. Нам патрэбны тыя, хто адчувае дух народа, хто верыць у непераможную сілу і моц нашай Бацькаўшчыны* [14, с. 127]. Так узвышаныя і высакародныя ідэі, якімі Корсак жыў усё сваё нядоўгае жыццё, за якія столькі адпакутаваў у польскім канцлагеры і нямецкай катавальні, выкарыстоўваюцца супраць яго і нечакана скіроўваюць на шлях злачынцы. Л. Корань так разважае пра гэта: «Міця не можа ўтульна абжыцца ў акупацыйным побыце, змірыцца са сваім месцам у ім, з доляю вязня дварчанскай жандармерыі, вызваленага ад расстрэлу Камашылам. Выпадак адлучыў Міцю ад блізкіх, пазбавіў магчымасці быць адносна непрыкметным для ўлад чалавекам “з масы”, як Улас Корсак, Алеся, Хрысця, Імполь, і гэтая адлучанасць для Міці – трагедыя» [9, с. 176].

Усведамляючы ўвесь жах і бязлітаснасць таго, што адбывалася, ён супраць сваёй волі стаў удзельнікам праследавання партызан. Не цэлячыся і не жадаючы патрапіць, выпадкова застрэліў дзяўчынупартызанку. Тое, пра што з жахам думаў некалі ў мірны час, гледзячы на разбуранае птушынае гняздо, спраўдзілася. Паводле В. Каваленкі, гэты стрэл для Міці «быў у самога сябе» [17, с. 246]. Нечакана ён наблізіўся да той мяжы, за якой ужо няма ніякага апраўдання*: Такі вялікі і такі непапраўны грэх! І далей перад табою чорная бясконцая яма...* [14, с. 204]. Паступова да яго прыйшло разуменне, што шлях у фашысцкі засценак прывёў да страты сябе, да здрадніцтва ўсяму, што было найвышэйшым сэнсам, такім важным і дарагім. Але канчаткова ўсвядоміў жыццёвую пастку Міця толькі пасля таго, як убачыў цела расстралянай Хрысці ў яме з многімі іншымі ахвярамі. У яго думках няма самаапраўдання – хутчэй, разуменне безнадзейнасці і прыняцце наканаванага: *Ад свайго ўжо не ўцяку – лёс такі* [14, с. 226]. Ад маральных пакут у сітуацыі безвыходнасці і непазбежнага людскога суду яго фактычна ўратавала ўласная смерць.

Забойства Міці даўнім ворагам, жорсткім і бязлітасным партызанам Рэпкам, стала недарэчнай выпадковасцю. Мяркуем, што пісьменнік наўмысна пазбавіў свайго героя ахвярнай смерці. Такі фінал, як ужо згадвалася, даследчыкі трактуюць па-рознаму. Акадэмік В. Каваленка звяртае ўвагу на адсутнасць адкрытага аўтарскага асуджэння і абгрунтоўвае пазіцыю В. Адамчыка тым, што «вельмі складаныя, страшэнна супярэчлівыя сацыяльна-палітычныя драмы і народныя трагедыі стаяць за лёсам персанажаў твора, каб іх можна было ацэньваць толькі з пункта погляду таго моманту, калі завяршыўся твор» [1, с. 545].

Іншае меркаванне мае Т. Грамадчанка: у смерці Міці даследчыца ўбачыла заканамернасць, што праяўляецца ў парадоксе часу, у якім жывуць героі раманаў, калі права кіраваць жыццём і вяршыць суд над іншымі атрымалі суб'екты, падобныя да Жэніка Рэпкі [3, с. 14]. Паглыбляецца гэта думка і ў даследаванні Л. Корань, якая гаворыць пра дэміфалагізацыю прадстаўнікоў савецкай улады, у тым ліку і партызан, ды самой сістэмы, што дала максімальныя паўнамоцтвы падобным тыпам: «Але самае страшнае – гэта тая вялікая, вельмі вялікая *ўласць* над чалавечымі жыццямі, якую мае Жэнік-партызан: пагнаў купку мужыкоў ноччу рэзаць тэлеграфныя слупы – і ўжо раніцай казакі замучылі і павесілі на крыжы знаёмага Жэніку з дзяцінства дзядзьку МарцінаВаўчка; закатаваў Рэпка выпадкова захопленага ворага – і вось ужо ўся Жэнікава родная вёска спалена разам з людзьмі» [9, с. 173–174].

З моманту выхаду апошняга рамана тэтралогіі «Голас крыві брата твайго» прайшло ўжо больш за 30 гадоў, аднак і з пазіцыі сённяшняга дня праблема, увасобленая ў вобразе маладога паэта Міці Корсака, застаецца не менш складанай і супярэчлівай. Занадта многа фактараў маральных, этычных, гістарычных, палітычных, нацыянальных – апасродкавана ці непасрэдна – паўплывалі на ўсіх тых апантаных юнакоў канца 1930-х гг., з чыіх лёсаў і склаўся гэты збіральны вобраз заходнебеларускага інтэлігента пад рознымі акупацыямі. У дзённіку 1970-х гг. В. Адамчык так ахарактарызаваў гэты персанаж: «Міця (Змітрык) – не Левін Талстога. Ён загіне ад тых людзей, дзеля якіх рабіў дабро. Дарэчы, гэта пакутная, усвядомленая смерць усяе нашае інтэлігенцыі. Беларуская Галгофа...» [18, с. 47].

Імклівае разгортванне падзей у раманным цыкле, унутры якіх існуе і дзейнічае чалавек, дае магчымасць паглядзець на ўсё з іншага пункта гледжання, дзе фаталістычная зададзенасць лёсу прадвызначана нейкімі іншымі сіламі, агульным ходам гісторыі. В. Каваленка падкрэсліваў, што «чытача зачароўвае і вядзе за сабой сам ход жыцця, з яго нечаканымі, але не стыхійнымі паваротамі, якія ўсё ж маюць сваю прычыннасць у нечым, што калісьці адбылося з людзьмі...» [1, с. 532].

Не здымаючы адказнасці з кожнага са сваіх персанажаў, В. Адамчык даследуе і знешнія прычыны, што садзейнічалі зменам у паводзінах людзей. З прыходам новай улады і класавай маралі, з увядзеннем новых парадкаў мяняюцца абставіны, якія даюць выйсце бязлітаснаму, жывёльнаму. Сяляне з шалёнай нянавісцю знішчаюць сядзібу асаднікаў. Падобнае стала магчымым і законным з прыходам савецкай улады. Не без падстаў мясцовыя жыхары называюць бальшавікоў нехрысцямі. Для вяскоўцаў гэтыя жыццёвыя змены распачынаюць усеагульны шлях да гібелі, да таго страшнага часу, калі брат пойдзе на брата, а скіраванасць на праўду і справядлівасць заменіцца падазронасцю і даносамі.

Паваротным пунктам стала жорсткае, абгрунтаванае класавай нянавісцю забойства асадніка Грабянкі прыхільнікамі новай улады. Яго зарубілі на вачах у сям'і і вяскоўцаў. Гэта падзея ў рамане «Год нулявы» адкрыла крывавы бок тых парадкаў, што прыйшлі на «Крэсы Всходні» пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з усходняй часткай. Жыццё людзей кардынальна змянілася. У сувязі са здарэннем змены здаваліся непрадказальнымі, катастрафічнымі, нараджалі страшныя прадчуванні.

Наступаў час, калі ўсё заблытвалася і кожны мог быць уцягнуты ў злачынства. Шляхі да выратавання губляліся, бо любы чалавек мог стаць і катам, і ахвярай. З таго, хто атрымаў права выносіць прысуды, Аўсянік, адданы баец савецкай улады, ператварыўся ў ахвяру і быў арыштаваны ўжо не польскімі ўладамі, а бальшавікамі. Пад увагу НКУС трапіў патрыёт бальшавік Царык. Наогул, яго трагічнае жыццё стала сімвалічным, паказальным у сваёй фаталістычнай зададзенасці: *Ты скажы, што*

*за лёс выпадае чалавеку: якая ўласць ні прыйшла, што ні змянілася на свеце, а ён усё нікому не патрапіць* [14, с. 240]. Пазней Міца не здолее ўратаваць яго з турмы, і Царыка расстраляюць немцы. Тым не менш Л. Корань падкрэслівае зніжаны статус гэтага персанажа. На думку даследчыцы, ён прадстаўляе тупіковае адгалінаванне: «...люстэрка змучанай, нехлямяжай нацыянальнай свядомасці, што ці не схібіла на выканкамаўскім пайку, што была не раз ашукана ў лепшых надзеях і неаднойчы нізрынута ў крывавую яму, поўную трупаў, што ледзь трымціць у стане перманентнай летаргіі» [9, с. 178].

Абсурдныя абставіны жыцця пазбаўлялі чалавека свабоднага выбару, спараджалі супярэчнасць, у якой не мелася адназначна правільнага, адэкватнага рашэння. Імкненне да зразумелага і агульнавядомага, што было засвоена на працягу жыцця, падсвядома прыспешвала апакаліптычную развязку, якая ўспрымалася як збавенне. З гэтай прычыны апісанне пачатку вайны выглядае нечакана заканамерным: *Вайна! Яна была чаканай, як чакаюць збавення, нават смерці ад нязлечнай хваробы* [16, с. 308].

Ваенная рэчаіснасць стала новым і самым страшным выпрабаваннем для верасаўцаў, як і для ўсяго народа. Паступова ўсіх аб'ядналі страх, непрадказальнасць, смерць. В. Адамчык – адзін з першых у беларускай рэалістычнай літаратуры, хто ўзняў тэму жыцця на акупаваных тэрыторыях і паказаў, што для мясцовага насельніцтва небяспеку ўяўлялі не толькі нямецка-фашысцкія захопнікі, але і свае – партызаны самых розных груповак і палітычных арыентацый. У поўнай меры гэта адлюстравана ў эпізодзе, калі жыхары вёскі паводле старажытнага звычаю, спрабуючы абараніцца ад бяды, што напаўзала з усіх бакоў, *абапал вёскі ставілі па крыжы* [14, с. 94]. Нечаканая начная сустрэча з мясцовымі партызанамі скончылася фатальна. Раніцай сялян чакала расправа паліцаяў. На новапастаўленым крыжы павесілі аднаго з жыхароў вёскі – Марціна Ваўчка.

Абсурдная ваенная рэчаіснасць прымусіла саступіць з пазіцыі неўмяшання і Уласа Корсака. На думку Н. Дамброўскай, ён «сапраўдны прыродны чалавек» [19, с. 101], бо жыве згодна з законамі продкаў. Падчас любых выпрабаванняў ён трымаецца годна, яго словы гучыць слушна і аўтарытэтна. Скрушліва выказанае *Памірай ці не памірай, а трэба рабіць* [13, с. 209] не толькі характарызуе працавітасць старога Корсака, але і ілюструе найвышэйшую ступень адданасці селяніна працы на зямлі, адказнасці за яе.

Паступова да вяскоўца прыйшло разуменне таго, што жыццё пачало рухацца сваім ходам, паўплываць на які ён ужо не здольны. Абставіны прымусілі паставіць пад сумненне перакананне ў тым, што, якая б улада ні прыйшла, як бы ні змяніліся абставіны, працавітасць, пазіцыя неўмяшання і ў той жа час арыентаванасць на катэгорыі народнай справядлівасці дазволяць захаваць дом, сям'ю. Рашэнне зарэгістраваць параненага камандзіра згодна з распараджэннем камендатуры выявіла маральную супярэчлівасць ваеннага часу. Праз сваю законапаслухмянасць Улас і выдаў немцам таго, каго ратаваў, і сам наблізіўся да пагібелі.

Шэраг выпадковасцей прывёў да трагічнага завяршэння жыцця Корсака і трагедыі вёскі. Дзеля забавы паліцэйскія застрэлілі чатырнаццацігадовае дзяўчо. Савецкія партызаны, нягледзячы на просьбы вяскоўцаў спыніцца, учынілі страшную расправу над забойцам. Адным з тых, хто здзейсніў тое пакаранне смерцю, стаў Жэнік Рэпка. Чалавек жорсткі, неўтаймоўны ў сваёй нянавісці, ён разгарнуўся на поўную сілу менавіта ў час ліхалецця, блізкага яму па духу бесчалавечнасці.

Нягледзячы на шкадаванне пра выпадковую і ад гэтага яшчэ больш несправядлівую смерць юнай Лёрці, прысутныя на расправе жыхары вёскі зразумелі, што помста праз катаванне і смерць спародзіць яшчэ большыя ахвяры. Страшная сцэна пашырыла межы катастрофы з-за хуткай змены роляў, калі ахвяра становіцца карнікам, а ўсе выпадковыя сведкі аб'ядноўваюцца агульным грахом і бядой. Спробы спыніць яшчэ большае ліха дзеля выратавання іншых былі беспаспяховымі. Маштабнасць і глыбіня трагедыі ўзнімаюць здарэнне на ўзровень сімвалічнага абагульнення, напоўненага апакаліптычным сэнсам.

Пасля расправы аднавяскоўцы хаваюцца па хатах, *адчуваючы жудасць і страх у душы і чакаючы новай немінучай бяды* [14, с. 143]. Яна прыйшла, бо за смерць паліцая было вырашана спаліць жыхароў вёскі. Менавіта стары Корсак, які заўсёды імкнуўся не ўмешвацца, не вытрымаў гэтай жудаснай несправядлівасці. Успамінаючы мінулую вайну, ён пайшоў да немцаў тлумачыць, заступацца за людзей, адстойваць іх невінаватасць. Але літасці не атрымаў.

Навіна пра пачатак вайны ўзнавіла ў памяці вяскоўцаў успамін пра былое будаўніцтва маста перад мікалаеўскай вайной. Аналогія Язапата Змыслы стала прароцтвам: *Значыцца, на бяду робім, будзем гарэць, як тады гарэлі* [16, с. 315]. Разам з прылуцкімі жыхарамі згарэў у хляве і Корсак, усведамляючы глыбіню трагічных перамен, што так перайначылі жыццё: *...тут ужо ўсяму цаны ды меры няма* [14, с. 150]. Так паступова лёс асобнага чалавека з'ядноўваецца з іншымі праз наканаванне: на ўсіх адзін лёс, непадуладны супраціўленню, непадлеглы зменам.

Каштоўнасны канфлікт, што прадуцыраваўся абсурднай рэчаіснасцю, разгарнуў маштаб граху да ўсенароднага. Так, у рамане «Чужая бацькаўшчына» старая Таквіля Мондрая бедавала па тым, што было яшчэ не ўсім відавочна: *Граху цяперака ніхто не баіцца* [15, с. 262]. Таксама Царык, захоплены

ідэямі Дастаеўскага ды пазнаннем душы, робіць выснову, што *цяперашні чалавек нічагутка не баіцца* [15, с. 432]. І ўжо з прыходам савецкай улады весела і смела пад гармонік гучыць з «чырвонага абоза»*: Кончыўся касцёл, цётка, настала кіно* [13, с. 219]. Урэшце стала зусім зразумела, што *ўжо ж выракліся ўсяго* [13, с. 219]. У фінале тэтралогіі апакаліптычныя матывы ўзмацняюцца, выяўляюцца маштабы спраўджаных пераўтварэнняў: *Людзі адцураліся ды выракліся ўжо самыя сябе* [14, с. 158]. Паводле М. Тычыны, драматызм падзей дасягне максімуму, калі «пачнецца распад нацыі як адзінага цэлага, яе маральныя дэзарыентацыя і дэградацыя» [20, с. 7]. Змены закранаюць усіх, бязлітасна прад'яўляюць рахунак на чалавечае жыццё і будучыню. А тое, што адбываецца ў свядомасці людзей, суадносіцца з Божай карай, толькі зазнаўшы ды выпакутаваўшы якую магчыма прайсці цярністы шлях да новага перараджэння.

В. Адамчык раскрывае трагічнасць чалавечага лёсу з яшчэ аднаго ракурсу, які можна было б акрэсліць як «без віны вінаватыя». Тэма гэта, побач з іншымі, узнікае ў Царыкавым успаміне пра спробу пераходу савецка-польскай мяжы яшчэ да пачатку Другой сусветнай вайны. Пасля затрымання траіх аднавяскоўцаў рускімі памежнікамі дадому, на «Крэсы Всходні», вярнуліся толькі двое. Трэцяга свайго таварыша Сцяпуру ўцекачы так больш і не бачылі. Пачуццё вінаватасці па вяртанні ўзмацняе і дакор Сцяпуравай жонкі. Яна ўпэўнена, што насамрэч сябры-ўцекачы расправіліся з яе мужам. Царык спавядаецца Міцю: *...мы так і жывём з Раманюком, носячы на сабе гэты выдуманы грэх...* [13, с. 234]. Пасля ўдзелу ў розных войнах Літавар жыве са скалечанай псіхікай і комплексам віны за тое, што жывы, цудам ўратаваўся, удала збег. На камплімент пра добрае сэрца сваёй спадарожніцы па цягніку ён адказвае: *Пабойцеся бога, якое ўжо добрае. Столькі нагледзеўся, столькі ўжо бачыў... што сэрца ўжо скамянела* [13, с. 123]. Многія героі В. Адамчыка жывуць з пачуццём, што яны «без віны вінаватыя». З'явіцца гэта адчуванне і ў старога Корсака пасля недарэчнай смерці лейтэнанта, пра што гаварылася вышэй. Стары верасавец зрабіў усё як след, ён проста не здолеў прадбачыць такой хуткай і недарэчнай расправы. Безумоўна, найбольш яскрава погляд на праблематыку «без віны вінаватых» выяўлены праз лёс Міці Корсака, чыё жыццё фактычна – гэта пакуты з-за віны, якой не меў, віны за беларускасць і перад польскай уладай, і перад савецкай, і, як потым высветліцца, перад самім беларускім народам – з-за супрацоўніцтва з фашыстамі. У дзённікавых запісах «Крэскі з аўтабіяграфіі» В. Адамчык прызнаваўся: «Вобраз Міці Корсака, які я шукаў у самім сабе, спярша здаваўся мне арыгінальным і нязбітанешаблонным, покуль я не дайшоў да Біблії, – вобраз Хрыста-пакутніка мы паўтараем усе» [21, с. 9]. Гэта «мы» выяўляецца праз многія лёсы персанажаў і злучаецца ў абагульнены вобраз беларускага народа – вобраз няпросты, супярэчлівы, шматпакутны.

Ідэя трагічнасці беларускага лёсу рэалізавана таксама праз кампазіцыю і сюжэтабудову тэтралогіі. Апакаліптычны пафас, драматычнае напружанне паступова нарастаюць ад рамана да рамана. Ад дастаткова павольнай, сузіральнай медытатыўнасці першага твора аповед у наступных становіцца ўсё больш дынамічным, рухомым; у апошнім рамане аўтарская ўвага канцэнтруецца на ключавых драматычных падзеях. Як адзначаў М. Тычына, «драматызм падзей нарастае і мацнее з кожным новым раманам, каб у заключным творы дасягнуць маштабаў мясцовага апакаліпсісу...» [20, с. 7]. Апакаліптычныя матывы, што гучаць ад пачатку трывожнымі згадкамі, як па спіралі, вяртаюцца жахлівай праўдай жыцця ў апошнім рамане.

## Заключэнне

Апакаліптычныя матывы ў тэтралогіі В. Адамчыка з'яўляюцца адным са спосабаў мастацкага ўвасаблення аўтарскай канцэпцыі трагічнасці народнага лёсу. Т. Грамадчанка падкрэслівае: «Думка пра радзіму, пра народ, да якога лёс і ў ХХ стагоддзі не стаў больш спагадным і літасцівым, пульсуе ў раманах Адамчыка. Выказана яна не публіцыстычна-аголена, а па-мастацку, праз чалавечыя характары» [3, с. 11].

Мастацкае палатно раманаў наскрозь пранізана апакаліптычнымі матывамі, яны звязваюць у адно гісторыю, час, падзеі, лёсы, паказваюць экзістэнцыяльную складанасць быцця чалавека, які адначасова і дзейсны суб'ект жыцця, і ахвяра гісторыі.

У тэтралогіі прасочана ўзаемазвязанасць і ўзаемаабумоўленасць розных праяў нацыянальнага быцця ў прасторы і часе. Пісьменнік пабудаваў сюжэтную лінію так, каб была магчымасць разгледзець праблему жыццёвага наканавання і праз гісторыка-палітычны, ваенны, культурна-пабытавы ракурсы, і праз існаванне асобнага чалавека, яго адказнасць і выбар, дзеянні і ўчынкі.

Аўтар не бярэ на сябе ролю суддзі, не выносіць прысуды. Ён імкнецца знайсці і зразумець знешнія прычыны і асабістую матывацыю паводзін сваіх персанажаў, асэнсаваць аксіялагічны канфлікт паміж старым і новым, верай і бязвер'ем, усвядоміць межы ментальнай катастрофы падчас глабальных канфліктаў.

Гісторыка-палітычныя і ваенныя падзеі прадстаўлены ў эпасе В. Адамчыка як анталагічная аснова жыцця. Але погляд пісьменніка антрапацэнтрычны, творцу цікавіць сам чалавек, яго псіхалогія і ўчынкі. Праз лёс кожнага свайго персанажа В. Адамчык прасочвае шлях да нацыянальнай трагедыі ў вымярэнні лакальным, прыналежным канкрэтнай асобе, і агульным, характэрным для большасці людзей. Кожны з герояў мае няпростую долю, нясе свой жыццёвы крыж. Аўтар прадстаўляе лёс беларусаў як шматпакутны крыжовы шлях, рух да нацыянальнай Галгофы.

Тэтралогія В. Адамчыка арыентуе на традыцыйныя беларускія каштоўнасныя першаасновы, утрымлівае моцны нацыяахоўны патэнцыял. Творы можна назваць своеасаблівым «апостальскім» пасланнем чытачам, у якім гучыць аўтарскае спадзяванне на лепшае: *Хто памажа нам сляпыя вочы? Хто зробіць нас відушчымі?* [14, с. 87]. Гэта не толькі аповед пра мінулае, але найперш клопат пра будучыню, пісьменніцкае папярэджанне свайму і будучым пакаленням.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Каваленка В. Вячаслаў Адамчык. У: Андраюк СА, Арочка М, Лаўшук СС, Гніламёдаў УВ, рэдактары. *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. Том 4, кніга 1. 1966–1985*. Мінск: Беларуская навука; 2002. с. 521–548.

2. Мельнікава А. *Нацыянальна-светапоглядныя каардынаты беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя.* Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны; 2016. 214 с.

3. Грамадчанка Т. Дайсці да праўды. Творчасць Вячаслава Адамчыка. *Роднае слова.* 1993;11:8–15.

4. Лецка Я. *Хараство і боль жыцця: нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка.* Мінск: Навука і тэхніка; 1985. 128 с.

5. Тычка Г. На неспазнаны круг жыцця... *Літаратура і мастацтва.* 1988, 28 лістапада. с. 6–7.

6. Дамброўская Н. *Проза Вячаслава Адамчыка: родава-жанравы і стылявы аспекты.* Брэст: Альтернатива; 2009. 182 с.

7. Рагуля А. Людзі на раздарожжы. *Літаратура і мастацтва.* 1977, 10 чэрвеня. с. 7.

8. Суддзева НЛ. Праблемы нацыянальнай гісторыі ў творчасці В. Адамчыка. У: *Зборнік тэзісаў дакладаў на навукова-метадычнай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага складу. Частка 2; 1993; Мінск, Беларусь.* Мінск: Мінскі інстытут культуры; 1993. с. 66–68.

9. Корань Л. *Цукровы пеўнік.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1996. 286 с.

10. Мельнікава А. Актуалізацыя нацыялагічнай праблематыкі ў беларускай літаратуры XX ст. У: Казакевіч А, рэдактар. *Пяты Міжнародны кангрэс даследчыкаў Беларусі. Працоўныя матэрыялы. Том 5; 2–4 кастрычніка 2015 г.; Каўнас, Літва.* Kaunas: Vytautas Magnus University Press; 2016. с. 166–169.

11. Тычко Г. *Беларуская літаратура XIX–XX стагоддзяў: час і асобы.* Мінск: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў; 2010. 267 с.

12. Бадак А. Хочу показать трагизм человеческой души. *Нёман*. 2013;11:150–152.

13. Адамчык В. *І скажа той, хто народзіцца. Раман.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1987. 319 с.

14. Адамчык В. *Голас крыві брата твайго: раман, апавяданне.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1991. 287 с.

15. Адамчык В. *Чужая бацькаўшчына. Раман.* Мінск: Папуры; 2015. 511 с.

16. Адамчык В. *Год нулявы.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1983. 396 с.

17. Каваленка В. Птах з падрэзанымі крыламі. *Полымя*. 1992;5:235–247.

18. Адамчык В. Ліст аканта. Фрагменты з дзённікаў. *Маладосць*. 1996;7:6–64.

19. Дамброўская Н. Вобраз прыроднага (натуральнага чалавека) у творчасці Л. М. Талстога і В. Адамчыка. В: Нестеренко АА, редактор. *Наследие Л. Н. Толстого и современность (175 лет со дня рождения). Материалы научной конференции; 13–14 ноября 2003 г.; Витебск, Беларусь.* Витебск: ВГУ; 2003. с. 101–103.

20. Тычына М. Развітанне з сялянскай Атлантыдай. Вобразны свет Вячаслава Адамчыка. *Роднае слова.* 2003;8:4–8.

21. Адамчык В. *Крэскі з аўтабіяграфіі. Выбраныя творы. Том 1. Чужая бацькаўшчына. Падарожжа на Буцафале: аповесць. Апавяданні.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1995. 479 с.

## References

1. Kavalenka V. Viachaslau Adamchyk. In: Andrajuk SA, Arochka M, Laushuk SS, Hnilamiodau UV, editors. *Gistoryja belaruskaj litaratury XX stagoddzja. Tom 4, kniga 1. 1966–1985* [The history of the Belarusian literature of the 20th century. Volume 4, book 1. 1966–1985]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2002. p. 521–548. Belarusian.

2. Mel'nikava A. *Nacyjanal'na-svetapogljadnyja kaardynaty belaruskaj litaratury pershaj trjeci XX stagoddzja* [National and ideological coordinates of the Belarusian literature of the first third of the 20th century]. Gomel': Francisk Skorina Gomel State University; 2016. 214 p. Belarusian.

3. Gramadchanka T. [Get to the truth. Creativity of Vyachaslau Adamchyk]. *Rodnae slova.* 1993;11:8–15. Belarusian.

4. Lecka Ja. *Harastvo i bol'zhyccja: narys tvorchasci Vjachaslava Adamchyka* [The beauty and pain of life: an essay on the work of Viachaslau Adamchyk]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1985. 128 p. Belarusian.

5. Tychka G. [On the unknown circle of life...]. *Litaratura i mastactva*. 1988 November 28. p. 6–7. Belarusian.

6. Dambrowskaja N. *Proza Vjachaslava Adamchyka: rodava-zhanravy i styljavy aspekty* [Prose Vyacheslav Adamchik: generic-genre and stylistic aspects]. Brest: Al'ternativa; 2009. 182 p. Belarusian.

7. Ragulya A. [People at the crossroads]. *Litaratura i mastactva.* 1977 June 10. p. 7. Belarusian.

8. Suddzeva NL. [Problems of national history in the works of V. Adamchyk]. In: *Zbornik tjezisaw dakladaw na navukova-metadychnaj kanferjencyi prafesarska-vykladchyckaga skladu. Chastka 2; 1993; Minsk, Belarus'* [Collection of abstracts at the scientific and methodological conference of the teaching staff. Part 2; 1993; Minsk, Belarus]. Minsk: Minsk Institute of Culture; 1993. p. 66–68. Belarusian.

9. Koran' L. *Cukrovy pewnik* [Sugar cock]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1996. 286 p. Belarusian.

10. Mel'nikava A. Actualization of naziological problems in Belarusian literature of the 20th century. In: Kazakevich A, editor. *The Fifth International Congress of Belarusian studies. Working Papers. Volume 5; 2015 October 2–4; Kaunas, Litva*. Kaunas: Vytautas Magnus University Press; 2016. p. 166–169. Belarusian.

11. Tychko G. *Belaruskaja litaratura XIX–XX stagoddzjaw: chas i asoby* [Belarusian literature of the 19th–20th centuries: time and persons]. Minsk: Belarusian State University of Culture and Arts; 2010. 267 p. Belarusian.

12. Badak A. [I want to show the tragedy of the human soul]. *Nyoman*. 2013;11:150–152. Russian.

13. Adamchyk V. *I skazha toj, hto narodzicca. Raman* [And that one who will be born will tell. Novel]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1987. 319 p. Belarusian.

14. Adamchyk V. *Golas kryvi brata tvajgo: raman, apavjadanne* [The Voice of your brother's blood: novel, stories]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1991. 287 p. Belarusian.

15. Adamchyk V. *Chuzhaja bac'kawshchyna. Raman* [Strange homeland. Novel]. Minsk: Papury; 2015. 511 p. Belarusian.

16. Adamchyk V. *God nuljavy* [The year zero]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1983. 396 p. Belarusian.

17. Kavalenka V. [Birds with clipped wings]. *Polymya*. 1992;5:235–247. Belarusian.

18. Adamchyk V. [Letter of acanthus. Fragments from the diaries]. *Maladosts'*. 1996;7:6–64. Belarusian.

19. Dambrowskaja N. [The image of the natural (natural man) in the works of L. N. Tolstoy and V. Adamchyk]. In: Nesterenko AA, editor. *Nasledie L. N. Tolstogo i sovremennost' (175 let so dnya rozhdeniya). Materialy nauchnoi konferentsii; 13–14 noyabrya 2003 g.; Vitebsk, Belarus'* [L. N. Tolstoy's legacy and modernity (175 years since his birth). Proceedings of the scientific conference; 2013 November 13–14; Vitebsk, Belarus]. Vitebsk: Vitebsk State University named after P. M. Masherov; 2003. p. 101–103. Belarusian.

20. Tychyna M. [Farewell to peasant Atlantis. The imaginative world of Viachaslau Adamchyk]. *Rodnae slova.* 2003;8:4–8. Belarusian.

21. Adamchyk V. *Krjeski z awtabijagrafii. Vybranyja tvory. Tom 1. Chuzhaja bac'kawshchyna. Padarozhzha na Bucafale: apo-vesc'. Apavjadanni* [Kreski from the autobiography. Selected works. Volume 1. Strange Homeland. Journey to the Bucephalus: novel. Stories]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1995. 479 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 18.05.2020.*
*Received by editorial board 18.05.2020.*